ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ
МІЖНАРОДНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ
ІМЯ А. Д. САХАРАВА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА
СВІСЛАЦКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
РЫМА-КАТАЛІЦКІ КАСЦЁЛ У БЕЛАРУСІ

Серыя «Беларусь і Эдвард Вайніловіч»

БЕЛАРУСЬ, СВІСЛАЦКІ КРАЙ І ЭДВАРД ВАЙНІЛОВІЧ

(да 765-годдзя г. Свіслач)

Матэрыялы
навукова-практычнай канферэнцыі

г. Свіслач, 13–14 жніўня 2021 г.

Мінск
«ІВЦ Мінфіна»
2021

УДК [94(476)+929Вайніловіч](082)
ББК 63.3(4Беи)я43
Б43

Серыя заснавана ў 2016 годзе

Рэдакцыйная калегія:
А. А. Каваленя (навук. рэд.), *Н. В. Анофранка*,
У. М. Завальнюк, В. Л. Лакіза, Н. Я. Новік,
А. Э. Сакольчык, У. С. Пуцік (адк. рэд.)

Рэцэнзент:
доктар гістарычных навук, загадчык аддзела
гісторыі Беларусі IX–XVIII стст. Інстытута гісторыі
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі *А. А. Мяцельскі*

Б43 **Беларусь**, Свіслацкі край і Эдвард Вайніловіч (да 765-годдзя г. Свіслач) : матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, г. Свіслач, 13–14 жніўня 2021 г. / Ін-т гіст. НАН Беларусі; рэд. кал. : А. А. Каваленя (навук. рэд.) [і інш.]; У. С. Пуцік (адк. рэд.). — Мінск : ІВЦ «Мінфіна», 2021. — 456 с. — (Серыя «Беларусь і Эдвард Вайніловіч»).

ISBN 978-985-880-195-3.

У зборніку змешчаны даследаванні беларускіх навукоўцаў, спецыялістаў па гісторыі Беларусі другой паловы XIX — першай трэці XX ст., прысвечаныя выдатнай асобе, рэфарматару, патрыёту сваёй Айчыны Эдварду Вайніловічу (1847–1928), а таксама Свіслачы і Свіслацкаму краю. На фоне гістарычных падзей як у Беларусі, так і за яе межамі адлюстраваны важнейшыя вехі з жыцця і дзейнасці нашага земляка.

Адрасуецца вучоным, выкладчыкам устаноў вышэйшай адукацыі, настаўнікам школ, краязнаўцам і ўсім тым, хто зацікаўлены ў вывучэнні амаль забытых старонак з гісторыі нашай Бацькаўшчыны.

УДК [94(476)+929Вайніловіч](082)
ББК 63.3(4Беи)я43

ISBN 978-985-880-195-3

© Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 2021
© Афармленне. УП «ІВЦ Мінфіна», 2021

Станіслаў Юрэцкі
Касцёл Святой Тройцы ў г. Свіслач: археалагічныя даследаванні ... 78

Валерый Пазднякоў
Найстаражытная гісторыя мястэчка Свіслач да XVI ст. (паводле неапублікаваных дакументаў) ... 94

Аляксандр Доўнар
Даныя пра жыхароў Свіслацкага краю ў актавых кнігах Поразава (першая палова XVIII ст.) ... 108

Аляксандр Ерашэвіч
Фінансаванне Свіслацкай гімназіі ... 124

Оксана Лепеш
Реорганизация Свислочской гимназии как проявление политики российского правительства в области образования после восстания 1830–1831 гг. ... 147

Кірыл Мядзведзеў
Міжканфесійныя шлюбы ў мяшчанскім асяроддзі беларуска-літоўскіх губерняў (1772–1860 гг.) ... 160

Ігар Гушчынскі
Асаблівасці судаўладкавання на тэрыторыі Гродзенскай і Віленскай губерняў у 1795–1840 гг. ... 179

Елена Филатова
Тадеуш Тышкевич — один из владельцев Свислочи ... 190

Наталля Анофранка
Земская паліцыя беларуска-літоўскіх губерняў у першай палове XIX ст.: складанасці і недахопы дзейнасці ... 199

По одним сведениям, прах генерала Тадеуша Тышкевича в 1939 г. был перевезен в Польшу и захоронен в Варшаве[21]. По другим сведениям — останки генерала, вместе с надгробием, перевезли в его бывшее владение Жарковщину. Во время Второй мировой войны могила была разрушена, а постамент остался без бронзового бюста. В 1988–1989 гг., при реставрационных работах, постамент был вновь установлен на территории усадьбы[22].

[21] Тадеуш Тышкевич. [Электронный ресурс]. URL: http://impereur.blogspot.com/2009/12/tadeusz-tyszkiewicz-1774-1852.html. — Дата обращения: 24.08.2021.

[22] Усадьба Дом графа Тышкевича. [Электронный ресурс]. URL: https://belbooking.by/place/usadba-dom-grafa-tyshkevicha. — Дата обращения: 24.08.2021.

Наталля Анофранка

ЗЕМСКАЯ ПАЛІЦЫЯ БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯЎ У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.: СКЛАДАНАСЦІ І НЕДАХОПЫ ДЗЕЙНАСЦІ

Асновай функцыянавання ніжніх земскіх судоў у Расійскай імперыі, у тым ліку на беларуска-літоўскіх землях, было «Учреждения для управления губерний Всероссийския империи» (далей — «Учреждения о губерниях»), прынятае 7 лістапада 1775 г. Паводле дакумента ніжні земскі суд (земская паліцыя) з'яўляўся калегіяльнай інстытуцыяй, якая стацыянарна знаходзілася ў павятовым горадзе, а яе кампетэнцыя распаўсюджвалася на ўвесь павет. Адначасова меркавалася, што ніжні земскі суд будзе «передвижным присутственным местом», якое ў поўным складзе павінна перамяшчацца ў любы пункт павета ў выпадку нейкага здарэння. Аднак такая мадэль ніжняга земскага суда ад самага пачатку была недзеяздольнай, бо штат земскіх судоў, які быў прапісаны ва «Учреждение о губерниях» быў надзвычай абмежаваны. У яго ўваходзілі земскі спраўнік (капітан-спраўнік), які з'яўляўся старшынёй земскага суда і кіраўніком павятовай адміністрацыі, а таксама 3–4 засядацелі земскага суда і сакратар[1].

У рэальным жыцці, ніжні земскі суд не з'яўляўся ні калегіяльным органамі, ні перасоўным прысутным месцам. Земскі спраўнік пастаянна знаходзіўся ў раз'ездах па розных справах.

[1] *Анучин, Е. Н.* Исторический обзор развития административно-полицейских учреждений в России / Е. Н. Анучин. — Изд. 2-е. — М.: URSS. — Ленинград, 2016. — С. 125.

Практычная ж неабходнасць прымусіла засядацеляў земскіх судоў падзяліць павет на перасанальна-адказныя ўчасткі, дзе яны знаходзіліся асноўны час, а ў афіцыйным месцазнаходжанні ніжняга земскага суда яны прысутнічалі па чарзе[2]. Такая практыка заканадаўча была афармлена толькі ў 1837 г. у сувязі з рэфармаваннем земскай паліцыі.

Правілы камплектацыі штату ніжніх земскіх судоў былі таксама прапісаныя ва «Учреждениях о губерниях». Згодна з імі пасады чыноўнікаў ніжніх земскіх судоў (земскі спраўнік і засядацелі) былі выбарныя. Павятовае дваранства са свайго асяродка абірала на пасады больш адпаведных кандыдатаў, а губернская адміністрацыя (губернатар, губернскае праўленне) зацвярджала на пасадах абраных чыноўнікаў. Аднак гэтыя правілы практычна не працавалі ў беларуска-літоўскіх губернях. У расійскага ўрада не было адзінай канцэпцыі адносна фарміравання складу земскіх судоў у заходніх губернях. На працягу першай паловы XIX ст. практыка прызначэння і выбарнасць на пасады ў ніжнія земскія суды чаргавалася або сумяшчалася. Акрамя гэтага, у адрозненне ад цэнтральных, у заходніх губернях не было засядацеляў ад «пасялян» (дзяржаўных сялян).

Функцыі ніжняга земскага суда былі вельмі шырокія. У першую чаргу ў яго кампетэнцыю ўваходзілі абавязкі выканаўчай паліцыі: «охранение благочиния, добронравия и порядка; наблюдение за исполнением предписанного в законе и приведения в исполнение решений высших присутственных мест; следственные (предварительное следствие) и судебные функции (разбирательство по маловажным проступкам); приведение в исполнение приговоров по уголовным и гражданским делам; розыск и поимка беглых крестьян, контроль за состоянием дорог, мостов, торговли; хозяйственные вопросы,

[2] Тамсама.

попечение о школах, народном продовольствии, здоровье, презрении бедных»[3].

Акрамя таго, на земскую паліцыю ўскладаліся абавязкі па абслугоўванні, створаных у пачатку XIX ст., міністэрстваў. Як адзначыў Я. М. Анучын, стварэнне міністэрстваў прывяло да заблытанасці сярод губернскіх устаноў, пры гэтым найбольшы цяжар выпаў «на низшие инстанции — земские суды, сделавшиеся сразу единственным местным органом нескольких центральных учреждений»[4]. Такім чынам, ніжнія земскія суды ў беларуска-літоўскіх губернях падпарадкоўваліся грамадзянскім губернатарам, генерал-губернатарам, губернскім праўленням і Міністэрству ўнутраных спраў, а таксама выконвалі загады і даручэнні Міністэрства юстыцыі, Міністэрства фінансаў, Міністэрства казённых маёмасцей і г. д.

Шматлікія абавязкі ніжніх земскіх судоў былі прапісаныя ва «Учреждениях о губерниях», аднак узаемадзеянне з рознымі павятовымі і губернскімі ўстановамі, як і ўзаемадзеянне земскіх паліцый розных паветаў і губерняў, не знайшлі дакладнага адлюстравання. Напрыклад, у 1832 г. Віцебскі грамадзянскі губернатар М. І. Шрэдар атрымаў скаргу ад Камісіі ваеннага суда, заснаванага пры Віцебскім арданнанс гаўзе (ордонанс гаузе), у якой гаварылася, што Камісія 15 лютага 1832 г. распарадзілася, каб Полацкі, Гарадзецкі, Себежскі і Рэжэцкі земскія суды «беспрепятственно отрядили чиновников своих для совместного производства с подпорутчиком Пылинским следствия»[5]. Пры гэтым Пылінскі ў рапаце ад 21 лютага 1832 г. паведаміў, што Полацкі земскі суд і пасля трох зваротаў так

[3] *Тот, Ю. В.* Реформа уездной полиции в правительственной политике России в XIX веке: дис. ... д-ра ист. наук. / Ю. Тот. — СПб., 2003. — С. 6.

[4] *Анучин, Е. Н.* Исторический обзор развития административно-полицейских учреждений в России. — С. 114.

[5] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 3654. Арк. 3.

і не выслаў да яго чыноўніка, з-за чаго ён змарнаваў два тыдні ўвёсцы Доўгая Ніва[6]. У выніку Камісія ваеннага суда звярнулася да Віцебскага грамадзянскага губернатара з просьбай загадаць Полацкай земскай паліцыі камандзіраваць чыноўніка ў дапамогу Пылінскаму, а таксама нагадаць Себежскаму і Рэчыцкаму земскім судам, што яны таксама павінны камандзіраваць сваіх чыноўнікаў[7].

Часам у межах аднаго павета ўзнікалі праблемы ўзаемадзеяння двух структур, у абавязак якіх уваходзіла падтрыманне грамадскага парадку — земскай паліцыі і ўнутраннага гарнізоннага батальёна (унутранай варты). Так, 4 верасня 1833 г. камандзір Віцебскага ўнутранага гарнізоннага батальёна маёр Крываблоцкі падаў рапарт Віцебскам губернатару М. І. Шрэдару, у якім скардзіўся на Віцебскую земскую паліцыю. Ён пісаў, што ў карчамах, што недалёка ад Віцебска, бываюць «скопища здешних обывателей», асабліва па нядзелях і святочных днях, якія займаюцца п'янствам, бойкамі і іншымі супрацьпраўнымі дзеяннямі. Аднак яго батальён і мясцовая жандарская каманда без суправаджэння земскіх паліцэйскіх чыноўнікаў не могуць спыніць гэта п'янства і правапарушэнні[8]. Крываблоцкі прасіў губернатара для захавання цішыні і супакою «об отряжении, хотя бы в воскресные и праздничные дни, в загородные корчмы полицейских и земских чиновников»[9]. Са свайго боку, М. І. Шрэдар ў лісце ад 26 студзеня 1834 г. выказаў незадаволенасць гарнізонным батальёнам: «рядовые здешнего батальёна отлучаясь из города и занимаясь в загородных корчмах неумеренным пьянством, производят драки, шум и буйство, теряют казенную аммуницию, валяются бе чувств по дорогам, а иногда лишаются через употребление горячих напитков или по другим причинам самой жизни»[10]. Для спынення гэтых беспарадкаў ён загадаў ніжнім чынам земскай паліцыі, пастаянна ці перыядычна аглядаць ўсе бліжэйшыя да горада карчмы і ўсіх нецвярозых вайскоўцаў пад вартай дастаўляць у Віцебск у батальённую канцылярыю. Акрамя гэтага віцебскі земскі спраўнік павінен быў папярэдзіць уладальнікаў або арандатараў корчмаў, каб ніжнім воінскім чынам мясцовага батальёна, нават за наяўныя грошы, не прадавалі тарэлкі[11].

Узаемадзеянне паліцый сумежных губерняў было складаным і магло выглядаць наступным чынам. У 1834 г. у Дзісенскім павеце Мінскай губ. былі абрабаваны дзве карчмы Млынарова і Чарапы. Дзісенскі ніжні земскі суд арыштаваў па гэтай справе пяць чалавек, але пад падазрэнне патрапілі мяшчане Волкі, якія пражывалі ў Лепельскім павеце Віцебскай губ.[12] У выніку Дзісенскі земскі суд звярнуўся да Мінскага грамадзянскага губернатара А. Ф. фон Дрэбуша, які, у сваю чаргу, звязаўся з Віцебскім грамадзянскім губернатарам М. І. Шрэдарам, каб апошні загадаў Лепельскаму земскаму спраўніку даведацца ці знаходзіліся мяшчане Волкі ў сваім доме ў ноч з 31 жніўня на 1 верасня[13].

У тым выпадку, калі неабходна было ўзаемадзеянне паліцый не сумежных губерняў, бюракратычны ланцуг быў даўжэйшы. У студзені 1834 г. на тэрыторыі Чарнігаўскай губ. адбылося злачынства — нехта Іван Кавалеўскі зрабіў замах на жыццё нейкага Весялоўскага. У ходзе вышуку тамтэйшая паліцыя высветліла, што сведкі злачынства браты Клімавы знаходзяцца ў Дынабургу ў Віцебскай губ. Пра неабходнасць дапытаць гэтых людзей Чарнігаўскі грамадзянскі губернатар М. І. Жукаў паведаміў Маларасійскаму ваеннаму губерната-

[6] Тамсама.
[7] Тамсама. Арк. Задв.
[8] НГАБ. — Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 4212. Арк. 1.
[9] НГАБ. — Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 4212. Арк. 1.

[10] Тамсама. Арк. 4–4адв.
[11] Тамсама. Арк. 4адв.
[12] НГАБ. — Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 5050. Арк. 1адв.
[13] Тамсама. Арк. 1.

ру М. Г. Раннін-Валконскаму, а той у сваю чаргу, звярнуўся да міністра ўнутраных спраў Д. М. Блудава. У выніку, з Міністэрства ўнутраных спраў даслала Віцебскаму грамадзянскаму губернатару М. І. Шрэдару адпаведнае распараджэнне, у якім паведамлялася, што Чарнігаўскі губернатар праз Міністэрства ўнутраных спраў просіць Віцебскага губернатара зрабіць адпаведнае распараджэнне і паскорыць дастаўленне яму вынікаў па запыце аб сведках злачынства[14]. Такім чынам, у працэс раскрыцця злачынства і допыту сведкаў былі ўцягнуты наступныя інстанцыі: паліцыі Чарнігаўскай і Віцебскай губерняў, два грамадзянскія губернатары, адзін ваенны губернатар, Міністэрства ўнутраных спраў і непасрэдна сам міністр Д. М. Блудаў.

Такім чынам, пры неабходнасці ўзаемадзеяння земскай паліцыі з рознымі павятовымі і губернскімі інстанцыямі і ўстановамі, сумежнымі павятовымі паліцыямі, сумежнымі, а таксама не сумежнымі губернскімі паліцыямі фігурай-пасярэднікам або ключавым звяном быў грамадзянскі губернатар. Калі ўзаемадзеянне выходзіла на міжгубернскі ўзровень у бюракратычны ланцуг уключалася Міністэрства ўнутраных спраў альбо непасрэдна міністр унутраных спраў. Такім чынам, перадача распараджэнняў і ўзгадненні па адміністратыўнай іерархіі істотна замуруджвала працу паліцэйскіх устаноў, у тым ліку і ніжніх земскіх судоў.

Асаблівымі былі кантакты земскай паліцыі з паштовымі установамі, якія не павінны былі па першым патрабаванні і бескарысна дапамагаць чыноўнікам ніжняга земскага суда. У некаторых выпадках такія дзеянні ўвогуле забараняліся без спецыяльнага прадпісання. Напрыклад, у 1842 г. Акруговае пошт-інспектарства пісала Віцебскаму грамадзянскаму губернатару Н. М. Кляменцьеву, што станцыйныя наглядчыкі насуперак «начальственных предписаний» і інструкцый дазваляюць чыноўнікам земскай паліцыі браць паштовых коней без прагонаў і падарожных. Пошт-інспектар VI акругі 4 чэрвеня 1842 г. звязаўся з Віцебскай губернскай паштовай канторай і прыгразіў станцыйным наглядчыкам, што ў выпадку, калі яны будуць даваць коней паліцэйскім бясплатна або не даняць пра тое, што паліцэйскія іх забралі пад прымусам, будуць звольнены з пасад[15].

[14] НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 3739. Арк. 5–5адв.

У дадзеным выпадку такая вострая рэакцыя з боку паштовых чыноўнікаў была абумоўлена здарэннем, якое адбылося 23–24 чэрвеня 1842 г. на паштовай станцыі мястэчка Шлыні. Туды прыбылі чыноўнікі Суражскага земскага суда (неадменны засядацель Кандратовіч, пісьмавод Шашкоўскі і земскі спраўнік) і без падарожнай запатрабаавалі паштовых коней да мястэчка Усвят. Наглядчык ім адмовіў, але яны загадалі старасце з яўрэяў запрагаць коней. Чыноўнікі ўзялі тры тройкі коней, з'ездзілі ва Усвят і вярнуліся. Пры гэтым засядацель Кандратовіч і пісьмаводчык Шашкоўскі заплацілі за прагон, а земскі спраўнік не заплаціў[16]. У выніку Акруговае пошт-інспектарства запатрабавала ад Віцебскага грамадзянскага губернатара, каб ён забараніў чыноўнікам земскіх паліцый «брать без подорожень и платежа прогонов почтовых лошадей для своих разъездов»[17], а таксама зрабіў вымову чыноўнікам Суражскага земскага суда і загадаў земскаму спраўніку неадкладна заплаціць наглядчыку Шлыноўскай паштовай станцыі за свой праезд да Усвят і назад[18].

Пра хібы, якія ад самага пачатку вылучаліся ў законах аб земскай паліцыі, пісалі правазнаўцы-паліцэісты яшчэ ў XIX ст. Асноўную праблему яны бачылі ў колькасным і якасным складзе. У адпаведнасці з «Учреждениями о губерниях»,

[15] НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 10044. Арк. 1.
[16] Тамсама. Арк. 1адв.
[17] Тамсама. Арк. 2.
[18] Тамсама. Арк. 2адв.

штат ніжніх земскіх судоў быў малакольксны і абмяжоўваўся 4–5 асобамі. Расійскія правазнаўцы адзначалі, што ў гэтых чыноўнікаў фізічна не было магчымасці «разобрать всякую ссору, исследовать всякие происшествия, если эти же лица, и в то же самое время, должны были преследовать преступления, производить по ним следствия, взыскивать подати и недоимки, наблюдать за починкою дорог, провожать проходящие войска, собирать справки и прочее»[19].

Нізкая прафесійная якасць земскай паліцыі была абумоўлена непрыстыжнасцю службы ў ніжніх земскіх судах, асабліва гэта датычылася беларуска-літоўскіх губерняў. Як адзначаў у пачатку XIX ст. Ф. В. Булгарын, характарызуючы земскія суды ў беларуска-літоўскіх губернях, «не было охотников занимать полицейские должности»[20]. Гэта было абумоўлена тым, што аклады паліцэйскіх чыноўнікаў не адпавядалі ўзроўню коштаў і асаблівасці грашовага абарачэння ў заходніх губернях. Паліцэйская дзейнасць патрабавала ад земскага спраўніка і засядацеляў пастаянных раз'ездаў па павеце, аднак грошаў на ўтрыманне коней казна не давала, а чужыя падводы бясплатна выкарыстоўваць было забаронена[21]. Так, на першае дзесяцігоддзе XIX ст. земскі спраўнік атрымліваў жалаванне 375 руб. асігнацыямі на год (90 руб. серабром). На гэтыя грошы ён павінен быў аплочваць кватэру, набываць дровы, карміць сям'ю і мець «хоть одного слугу»[22].

---

[19] *Анучин. Е. Н.* Исторический обзор развития административно-полицейских учреждений в России. — С. 116.

[20] Цыт. па: *Киселев, А. А.* Земская полиция белорусских губерний накануне отечественной войны 1812 года. / А. А. Киселев // Идеологические аспекты военной безопасности. — 2012. — № 3 (16). — С. 26.

[21] *Киселев А. А.* Земская полиция белорусских губерний накануне отечественной войны 1812 года. — С. 26.

[22] Тамсама.

Паліцэйская дзейнасць ніжніх земскіх судоў патрабавала ад чыноўнікаў пэўных прафесійных якасцей. Аднак у першае дзесяцігоддзе XIX ст. у беларуска-літоўскіх губернях назіраўся дэфіцыт хоць у якой ступені кваліфікаваных кадраў. У той час, як у цэнтральных расійскіх губернях паліцэйскія пасады ў выніку дваранскіх выбараў займалі чыноўнікі, якія прайшлі воінскую або цывільную службу, «следовательно сколько-нибудь люди опытные», то ў беларуска-літоўскіх губернях, у лепшым выпадку, толькі земскі спраўнік мог ведаць сваю справу[23].

Пасада земскага спраўніка ў беларуска-літоўскіх губернях стала выбарнай з 1802 г., аднак хутка стала бачна прафесійнага няздольнасць выбраных начальнікаў земскіх судоў. Таким чынам, указам ад 3 сакавіка 1805 г. у шэрагу губерняў, у тым ліку ў «Белорусских, Литовских, Киевской, Минской, Волынской и Подольской», змяняўся парадак прызначэння земскіх спраўнікаў. Кандыдатаў на гэтыя пасады падбіраў губернатар і прадстаўляў на разгляд міністру ўнутраных спраў. Далей гэтыя кандыдатуры ўзгадняліся з міністрам унутраных спраў, які прадстаўляў іх для зацвярджэння ў Сенат[24].

Што датычылася дваранскіх засядацеляў, то яны працягвалі выбірацца мясцовым дварансвтам «на прежних основаниях» тэрмінам на 3 гады. Аднак па водгуках сучаснікаў, на гэтую паліцэйскую пасаду «большей частью поступают люди нигде не служившие, ни законов, ни русской грамоты не знающие»[25]. У сувязі з гэтай праблемай 7 снежня 1811 г. Камітэт міністраў разглядаў прапановы Віленскага губернатара А. С. Лавінскага па выніках рэвізіі дзейнасці земскай паліцыі. Губернатар пі-

---

[23] Тамсама.

[24] Полное собрание законов Российской империи. [Собрание 1-е. С 1649 по 12 декабря 1825 г.] — СПб.: Тип. 2-го Отд-ния Собств. Е. И. В. канцелярии, 1830. — Т. 28. — С. 885. — № 21648.

[25] Цыт. па: *Киселев А. А.* Земская полиция белорусских губерний накануне отечественной войны 1812 года. — С. 26.

саў: «Заседатели нимало не обращают попечение о усердном исполнении своих обязанностей, поступая несмело <...> дабы при дворянских выборах сохранить свои места»[26]. У якасці меры па паляпшэнні дзейнасці земскіх судоў А. С. Лавінскі прапанаваў прызначыць у дапамогу ніжнім земскім судам «из мелкой грамотной шляхты, парафиальных дозорцев, в каждой парафии по одному, кои будут служить из особой определенной им хлебной ссыпки, безобидной для обывателей»[27]. Аднак Камітэт міністраў гэту прапанову адхіліў.

У сакавіку 1812 г. з'явілася запіска невядомага аўтара «О земской полиции», у якой разглядалася дзейнасць ніжэйшых земскіх судоў у Віленскай губ. У дакуменце ў якасці паляпшальнай меры прапаноўвалася перайсці ад выбараў засядацеляў ад дваранства да іх прызначэння ад урада (ад кароны). Толькі пры гэтай умове паліцэйскія пасады змогуць заняць людзі «знающие русский язык, законы, порядок и по непосредственной уже зависимости от одного только правительства, усердными к службе»[28]. Камітэт міністраў 16 красавіка 1812 г. дазволіў прызначаць у ніжнія земскія суды Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Валынскай, Падольскай і Кіеўскай губернях, а таксама Беластоцкай вобл. і Тарнопальскім краі па два засядацялі ад кароны[29].

Праблему ніжніх земскіх судоў у Расійскай імперыі падымаў дзяржаўны дзеяч і заканатворца М. М. Спяранскі. Прынамсі, земскаму спраўніку ён даў наступную характарыстыку: «От поимки простого бродяги до самых важных и многосложных уголовных следствий, все лежит на его (исправника) ответственности; от полтинной пошлины за гербовую бумагу до

[26] Тамсама. С. 27.
[27] Тамсама.
[28] Тамсама.
[29] Цыт. па: *Киселев А. А.* Земская полиция белорусских губерний накануне отечественной войны 1812 года. — С. 26.

сотен тысяч недоимок, во всем он ответствует, за все его винят и с него взыскивают. Но кто же есть сие странное лицо, от коего требуют такой всеобъемлемости? Это большею частью отставной офицер, служащий или по неволе или из-за куска насущного хлеба. Следовательно, не удивительно, что существуют злоупотребления и упущения, но дивиться по истине должно, что есть еще в уездах какая-нибудь тень управления, — правда, что одна только тень, и то весьма слабая»[30].

Сугучную характарыстыку чыноўнікам земскай паліцыі даў правазнаўца-паліцэіст Я. М. Анучын. Ён адзначыў: «Добросовестный чиновник не был в состоянии выполнить надлежащим образом своих обязанностей и сам являлся первым примером ослушания начальства»[31]. За невыкананне сваіх абавязкаў гэтыя чыноўнікі падвяргаліся пакаранню, заліваліся ў часовыя, «оставаясь такими до самого окончания накопившихся при них дел и взыскания недоимок, без жалования, даже без возможности не только выйти в отставку, но и взять отпуск»[32]. У выніку празмерная колькасць абавязкаў і даручэнняў, а таксама прымусы і вымовы з боку губернскага начальства рабілі службу ў ніжніх земскіх судах вельмі непрывабнай[33]. Расійскі правазнаўца І. Я. Андрэеўскі адзначыў: «Должности и капитан-исправника, и заседателей земского суда, и, особенно в последствии становых приставов, сделались не только неприглядными и непочетными, но умалили

[30] *Анучин, Е. Н.* Исторический обзор развития административно-полицейских учреждений в России, с Учреждения о губерниях 1775 г. до последнего времени / Е. Анучин. — СПб: тип. Министерства внутренних дел, 1872. — С. 114.
[31] Тамсама. С. 116.
[32] Тамсама. С. 115.
[33] *Анучин, Е. Н.* Исторический обзор развития административно-полицейских учреждений в России. — С. 115.

почет тех, которые соглашались попробовать в этой области свои дворянские силы»[34].

У выніку нежадання адукаваных дваран служыць у земскай паліцыі склалася сітуацыя, калі і на выбарныя пасады, і на прызначальныя імкнуліся патрапіць людзі, якія мала клапаціліся пра агульны дабрабыт. Яны рабіліся прадметам пагарды «в глазах лучшей части дворянства, избегавшей не только избрания, а даже и самого присутствия на выборах»[35]. Кадравы крызіс у земскіх судах прывёў да падзення аўтарытэту і падрыву легітымнасці гэтых дзяржаўных устаноў. Я. М. Анучын пісаў: «Уважение к ним потерялось, доверие к ним вовсе не существовало, а между тем они всё еще продолжали служить главным основанием суда и расправы»[36].

Расійскі ўрад у 1826 г. зрабіў спробу палепшыць сітуацыю з кадравым складам ніжніх земскіх судоў: для гэтага быў створаны «Комитет 6 декабря 1826 года». У гэты камітэт губернатары дасылалі звесткі пра стан земскіх судоў, складанасці і перашкоды ў іх дзейнасці. З гэтых звестак вынікала неабходнасць падняць жалаванне земскаму спраўніку да 1000–4000 руб. на год, а засядацелю земскага суда да 800–2000 руб. на год. Такім чынам, на дзейнасць усіх земскіх судоў у імперыі была неабходна сума да 5 млн 300 тыс. руб. на год, у той час як з казны на той момант выдаткоўвалася толькі 900 тыс. руб. Урад Расійскай імперыі не быў гатовы на столькі павялічыць выдаткі на земскую паліцыю, у выніку ўсе прапановы былі адхілены[37].

У 1828 г. Міністэрства ўнутраных спраў узначаліў генерал-губернатар Фінляндыі А. А. Закрэўскі. Прааналізаваўшы

[34] Цыт. па: *Тот, Ю. В.* Реформа уездной полиции в правительственной политике России в XIX веке. С. 6.

[35] *Анучин, Е. Н.* Исторический обзор развития административно-полицейских учреждений в России. — С. 115.

[36] Тамсама. С. 116.

[37] Тамсама. С. 124.

стан ніжніх земскіх судоў, ён склаў запіску пад назвай «О затруднениях, встречаемых гражданскими губернаторами, губернскими правлениями, полицейскими и уездными судами к надлежащему исполнению обязанностей службы», якая разглядалася Камітэтам міністраў 16 мая і 2 чэрвеня 1831 г.[38]. На яго думку, асноўная прычына складанасцей і маруднасці розных інстанцый пры выкананні сваіх службовых функцый заключалася ў нізкім жалаванні чыноўнікаў губернскіх і павятовых устаноў. Аклады па штаце ніжняга земскага суда не змяняліся з 1812 г. і складалі: земскага спраўніка (IX клас) у губернях I разраду — 250 руб., у губернях II разраду — 300 руб., аклад земскага заседацеля да 1812 г. складаў 100 руб., пасля 1812 г. 60 руб. Сакратар земскага суда ў губернях I разрада — 200 руб., II разрада — 250 руб[39]. На канцылярскіх служачых і выдаткі у губернях I разраду — 238 руб., II — 300 руб. (пасля 1812 г.)[40].

На думку міністра, менавіта нізкія аклады прывялі да таго, што ў штат земскай паліцыі траплялі людзі, якія проста не змаглі знайсці іншага месца службы. А. А. Закрэўскі пісаў: «Какого же можно ожидать усердия от человека решившего служить за пять, и даже за один только рубль в месяц... В сем положении, кто может льститься надеждою удержать руку истаивающего от нужды человека принять предлагаемых, а может быть в тайне требуемых от просителей мелких денег? Это есть корень лихоимства и разврата чиновников»[41]. Міністр чарговы раз прапанаваў падвоіць аклады земскім спраўнікам, засядацелям,

[38] *Тот, Ю. В.* Реформа уездной полиции в правительственной политике России в XIX веке. — С. 66.

[39] *Тот, Ю. В.* Реформа уездной полиции в правительственной политике России в XIX веке. — С. 66.

[40] Тамсама. С. 67.

[41] Цыт. па: *Тот, Ю. В.* Реформа уездной полиции в правительственной политике России в XIX веке. — С. 67.

сакратарам земскім судоў, а таксама павялічыць сумы на канцылярскія выдаткі. Камітэт міністраў прызнаў мэтазгоднасць гэтых прапаноў[42]. Аднак Мікалай I у рэзалюцыі на запіску міністра ўнутраных спраў напісаў: «В необходимости сих мер я давно убежден, но убежден в совершенной невозможности ныне со стороны Министерства финансов сему помочь»[43].

Замест павелічэння фінансавання земскай паліцыі, імператар зацвердзіў рашэнне Дзяржаўнага савета ад 17 снежня 1831 г. «О лучшем устройстве земских судов и должности земского исправника». У гэтым дакуменце гаварылася, што земскі спраўнік павінен выконваць толькі тыя абавязкі, якія на яго ўскладзены «Учреждение о губерниях» і не займацца малаважнымі справамі, каб ён «во всех занятиях своих удерживал степень главного лица и начальника по части уездной»[44]. У 1832 г. Мікалай I звярнуўся да дваран з просьбай, каб яны не ўхіляліся ад службы ў земскай паліцыі і выбіралі на пасады людзей годных. Гэты зварот быў падмацаваны невялікім павышэннем жалавання за кошт мясцовых рэсурсаў — павятовы збор быў павышаны на 30 кап. Аднак гэтыя сумы былі не дастатковыя, а прынятыя меры не эфектыўнымі[45].

Рэформа земскай паліцыі 1837 г., якая заканадаўча замацавала даўнюю практыку падзелу павета на ўчасткі, якія атрымалі назву «станы», а таксама змяніла назвы пасад чыноўнікаў земскіх судоў, не вырашыла праблемы ні фінансавання, ні прэстыжнасці службы ў земскай паліцыі.

---

[42] *Тот, Ю. В.* Реформа уездной полиции в правительственной политике России в XIX веке. — С. 68.

[43] Цыт. па: *Тот, Ю. В.* Реформа уездной полиции в правительственной политике России в XIX веке. — С. 67.

[44] *Тот, Ю. В.* Реформа уездной полиции в правительственной политике России в XIX веке. — С. 68.

[45] *Борисов, В. В.* Три века российской полиции / В. Борисов, А. Малыгин, Р. Мулукаев. — М.: РИПОЛ классик, 2016. — С. 203.

У беларуска-літоўскіх губернях кадравая праблема ніжніх земскіх судоў атрымала адлюстраванне ў дакументах губернскага справаводства і перапісцы чыноўнікаў. Напрыклад, у ліпені 1832 г. Лепельскі земскі спраўнік скардзіўся Віцебскаму губернатару М. І. Шрэдару на засядацеля Лепельскага ніжняга земскага суда Стэфаноўскага, які не выконвае свае абавязкі і ўхіляецца ад выканання распараджэнняў ніжняга земскага суда[46]. Па данясенні Чашніцкага ключ-войта выніка-ла, што камісіянер 12 класа камісіі Маскоўскага камісарыяцкага дэпо Палонін з 30 на 31 мая 1832 г. здзейсніў злачынства ў адносінах малалетняй дзяўчынкі Куліковай, якой было не больш за 12 год. Палонін будучы ў нецвярозым стане «сделал блуд с насильством, так что упомянутая девочка находится ныне больна»[47]. Стан дзяўчынкі пацвердзіў брыгадны лекар Бельскі. Аднак з-за таго, што ў мястэчку Чашнікі адсутнічаў засядацель, неабходна было тэрмінова прыслаць адпаведнага чыноўніка для правядзення вышуку[48]. Стэфаноўскаму было загадана тэрмінова адправіцца ў Чашнікі і разам дэпутатам ад ваеннага боку карнэтам рэзервовага гусарскага палка Цітовым, а таксама павятовым страпчым асведчыць пацярпелую дзяўчынку і правесці вышук пра ўчынак Палоніна. Па словах Лепельскага земскага спраўніка, засядацель Стэфаноўскі з пагардай паставіўся гэтага да яго пасады і звання, назваў сябе спраўнікам (верагодна яго павінны былі прызначыць на такую пасаду. — Аўт.) і адмовіўся выконваць гэта даручэнне. Як адзначыў спраўнік, гэта было не ў першыню, Стэфаноўскі і раней часам не выконваў розныя даручэнні — збор нядоімкі, высылка людзей на рамонт і г. д.[49].

---

[46] НГАБ. — Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 3485. Арк. 1.

[47] Тамсама. Арк. 3.

[48] Тамсама.

[49] НГАБ. — Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 3485. Арк. Задв.

Злоўжыванні з боку служачых земскай паліцыі таксама мелі месца. Напрыклад, Гарадокскі земскі спраўнік Івановіч, які нядаўна заняў гэтую пасаду, рапартам ад 31 мая 1831 г. паведаміў Віцебскаму, Магілёўскаму і Смаленскаму генерал-губернатару М. М. Хаванскаму, што знайшоў ён земскую павятовую паліцыю ў заняпадзе. Так ён пісаў: «Некоторые ключвойты вовсе неспособны; сотских и десятских ненадлежащее количество; дороги и мосты по проселочным трактам доведены до уничтожения»[50]. Шмат яўрэяў без кантролю раз'язджаюць па павеце і займаюцца «недозволительными промыслами». Нядоімкі з дзевяці памешчыкаў склалі 14 880 руб. 94 кап. Акрамя таго, што засталося шмат не выкананых спраў і пакінутых без увагі дакументаў, а былы земскі спраўнік Хлюдзінскі не раздаў членам суда жалаванне[51].

Поводзіны і маральны стан чыноўнікаў Гарадоцкага земскага суда таксама выклікалі незадаволенасць новага земскага спраўніка. Напрыклад, абурэнне выклікаў засядацель земскага суда Савіцкі, які разам з сакратаром павятовага суда Яхімовічам, са зволеным Хлюдзінскім, а таксама нейкім студэнт Віленскага ўніверсітэта, якія на святы ездзяць па розных населеных месцах павета, там балююць і гуляюць у карты[52]. У той жа час, на ўчастку засядацеля Савіцкага у ноч з 23 на 24 мая 1831 г. быў абрабаваны беглымі ўзброенымі салдатамі маёнтак памешчыцы Корсакавай. Таксама яму было даручана знайсці двух беглых салдат, якія стрэламі паранілі двух сялян Езерыйскага староства. Аднак ні па першым, ні па другім злачынстве Савіцкі не зрабіў нічога. У выніку, Івановіч прасіў М. М. Хаванскага выдаліць пералічаных асоб з Гарадоцкага павета[53].

[50] НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 3026. Арк. 4–4адв.
[51] Тамсама.
[52] Тамсама. Арк. 4адв.
[53] НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 3026. Арк. 5.

У сувязі з гэтай скаргай генерал-губернатар загадаў Віцебскаму губернатару М. І. Шрэдару праверыць сапраўднасць фактаў, ацаніць ступень шкоды і зрабіць захады да прывядзення дзейнасці Гарадоцкага земскага суда ў належны стан. У адносінах да Івановіча М. М. Хаванскі таксама зрабіў распараджэнне: «Поставить на вид исправнику, что ему надо быть не доносителем, но открывать и силою закона преследовать упущения, беспорядки и злоупотребления и тогда только выходить к главному начальству, когда существо дело превышает меру власти его»[54].

Генерал-губернатар М. М. Хаванскі таксама меў прэтэнзіі да дзейнасці ніжніх земскіх судоў. У 1833 г. у паветах Віцебскай губерні, асабліва ў Полацкім павеце, з'явіліся шайкі разбойнікаў і, як вынік, напады і рабаванні набылі масавы характар. Прычыны распаўсюджання гэтай сацыяльна-небяспечнай з'явы генерал-губернатар бачыў у кепскай дзейнасці мясцовай паліцыі. Ён пісаў да М. І. Шрэдара: «Такие случаи частых разбоев отнести можно не к иному чему, как к слабому действию Полоцкой земской полиции»[55]. Акрамя гэтага ў Полацкім павеце назіраўся недахоп выканаўцаў. Не было ні земскага спраўніка, ні павятовага прадвадзіцеля дваранства (папярэдні выбыў у Калугу), а ў павятовым судзе пуставалі вакансіі павятовага суддзі (апошні суддзя «был принужден оставить своё место по случаю обидного для него распоряжения Губернского правления») і сакратара[56].

У адносінах земскай паліцыі Дынабургскага павета, у якім таксама адбываліся разбоі, М. М. Хаванскі пісаў: «Стала достоверно известно, что по Динобургскому уезду в помещичьих имениях почти нет сотских и десятских, или если есть в них

[54] Тамсама. Арк. 5–5адв.
[55] НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 4004. Арк. 135.
[56] Тамсама.

которых, то разве только в тех, которые лежат при больших дорогах и то на случай собственно доставления проходящим воинским чинам подвод и квартир, и все сие селения остоваясь совершенно без земской полиции, находятся в непосредственном распоряжении самих владельцев и земский суд никогда не требует с оных ни сотских, ни десятских, ни лошадей для экстренных надобностей»[57].

З боку насельніцтва таксама выказвалася незадаволенасць дзейнасцю земскай паліцыі. У шэрагу выпадкаў гэта былі прэтэнзіі да ніжніх земскіх судоў як інстытуцыі, якія не выконвалі ці выконвалі недастаткова свае функцыі. Напрыклад, у 1829 г. памешчык Рокатаў напісаў прашэнне Віцебскаму грамадзянскаму губернатару А. М. Пяшчураву, у якім паведамляў, што на пачатку верасня нейкія злодзеі скралі чатырох коней у яго-ных сялян. Праз некаторы час да яго дайшлі чуткі, што коней трэба шукаць у Себежскім павеце. З дазволу памешчыка сяляне адправіліся ў гэты павет і ў маёнтку памешчыка Ульяноўскага пабачылі аднаго са скрадзеных коней. Аднак, калі сяляне Рокатава хацелі яго забраць, то паміж імі і сялянамі Ульяноўскага адбылася бойка. Сяляне Рокатава звярнуліся да мясцовага соцкага і адначасова паведамілі пра здарэнне свайму памешчыку.

Атрымаўшы паведамленне Рокатаў адправіў пасыльнага, каб той падаў скаргу аб здарэнні ў Себежскі ніжні земскі суд. Чыноўнікі гэтага земскага суда ўзялі паказанні як ў сялян Рокатава, так і ў сялян Ульяноўскага і вынеслі рашэнне, якое моцна абурыла памешчыка Рокатава. Ён пісаў у прашэнні губернатару, што Себежскі земскі суд загадаў «отдать лошадь тому же вору, у коего она была найдена»[58]. Такім чынам, сяляне былі не толькі блізкі да згубы коней і звязаных з пошу-

[57] НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 4004. Арк. 289–289адв.
[58] НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 1985. Арк. 3.

кімі выдаткаў, але і «побои оставались без удовлетворения». Паводле памешчыка Рокатава, выпадкова пра канфлікт даведаўся «благодетельный тамошний помещик» Канстанцін Лагоўскі, які ўвайшоў у становішча сялян Рокатава і настаяў, каб Себежскі ніжні земскі суд зноў дапытаў злодзеяў. Урэшце сяляне Ульяноўскага прызналіся, што збілі сялян Рокатава, а конь імі быў выменены ў нейкага Апочацкага селяніна. Выклаўшы факты і сутнасць праблемы памешчык Рокатаў прасіў Віцебскага губернатара прымусіць Себежскі ніжні земскі суд «к скорейшему окончанию дела сего, и к законному удовлетворению крестьян им украденых лошадей» альбо выплатай грошай за коней і панесеныя выдаткі[59].

У 1830 г. дваранін Гленбоцкі падаў скаргу Віцебскаму грамадзянскаму губернатару М. М. Гамалею на Суражскі земскі суд. Сутнасць справы заключалася ў тым, што жонка памешчыка Суражскага павета Лаўлянскага нанесла пабоі дачцэ дваранiна Гленбоцкага. Гленбоцкі падаў скаргу ў земскую паліцыю, якая павінна была правесці вышук. Аднак, па словах заяўніка, чыноўнікі Суражскага земскага суда, патураючы («в поноровку») памешчыцы Лаўлянскай, не толькі не пачалі вышук аб збіцці ягонай дачкі, але прымусіў яго жонку (Гленбоцкую) «примириться», г. зн. адмовіцца, ад абвінавачанняў. Акрамя гэтага, пад ціскам паліцэйскіх чыноўнікаў жанчына вымушана была падпісаць дакумент на рускай мове, «не понимая ни сего языка, ни того, что в том прошении было писано»[60].

У 1833 г. дваранка Брыгіда Вейсенгоф звярнулася ў Віцебскую губернскую адміністрацыю са скаргай на Суражскі ніжні земскі суд, які абвінавачвала ў выгароджванні злачынцы. Сутнасць справы заключалася ў тым, што Брыгіда Вейсенгоф і яе муж арэндавалі маёнтак у памешчыцы Клімовіч. Праблемы па-

[59] НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 1985. Арк. 3адв.
[60] НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 2416. Арк. 1адв.

чаліся тады, калі з памешчыцай Клімовіч «свёл короткое знакомство» былы засядацель Суражскага земскага суда Ракіцкі. Ён стаў поўным распараджальнікам усёй яе маёмасці. З-за «строптивости характера своего» неаднаразова рабіў Брыгідзе Вейсенгоф розныя крыўды і нарэшце напаў на маёнтак, які яна арандавала. Акрамя таго што Ракіцкі прычыніў шкоду гаспадарцы, ён нанёс пабоі мужу і самой Брыгідзе, нягледзячы на яе цяжарнасць. У выніку збіцця жанчына несваечасова нарадзіла мёртвае дзіця. Аднак, як сведчыла Брыгіда Вейсенгоф, Суражскі земскі суд «по пристрастии к стороне Ракицкого и Климович» імкнуўся гэтую справу заблытаць і апраўдаць былога земскага засядацеля. У такіх абставінах жанчына прасіла, каб Віцебскі губернатар, «для открытия в настоящем деле истины», накіраваў у Суражскі павет добранадзейнага чыноўніка[61].

Большасць скарг ад жыхароў паветаў было да канкрэтных чыноўнікаў ніжніх земскіх судоў. Напрыклад, у верасні 1828 г. дваранка Лепельскага павета Марыяна Закрэўжская падала прашэнне на імя Віцебскага, Магілёўскага і Смаленскага генерал-губернатара М. М. Хаванскага. У дакуменце гаварылася, што 4 жніўня 1828 г. паміж яе мужам дваранінам Закржэўскім і памешчыкам Горскім адбылася сварка, у выніку якой муж быў паранены «из ружейного выстрела дробью». Ад атрыманых раненняў ён памёр, што было пацверджана спраўнікам Лепельскага ніжняга земскага суда, павятовым страпчым і павятовым лекарам. Разабрацца ў гэтым здарэнні было даручана засядацелю Лепельскага земскага суда Лапіцкаму[62]. Сама Марыяна Закржэўская пасля забойства мужа засталася з чатырма дзецьмі. Яе і так цяжкае становішча пагаршалася яшчэ «неправильным производством о сем исследовании» засядацелем Лапіцкім. Як пісала Закржэўская: «Делал допросы подкупленным от Горского свидетелям в сем происшествии, а повальный обыск производил через жителей дальних деревень»[63]. Пры гэтым сяляне вёскі, дзе адбылося здарэнне не былі апытаныя[64].

Генерал-губернатар, каб «доставить бедной вдове с малолетними детьми хотя малейшее утешение в горести ее правильным и беспрестрасным производством сего дела»[65], загадаў Віцебскаму губернатару прызначыць для правядзення вышуку па забойстве двараніна Закржэўскага чыноўніка па асобных даручэннях. У лісце ад 5 снежня 1828 г. Віцебскі грамадзянскі адказаў, што даручыў весці гэтую справу тытулярнаму саветніку Авашчнікову разам з Лепельскім страпчым[66].

У 1832 г. полацкая дваранка удава Варвара Кавалеўская падала прашэнне Віцебскаму грамадзянскаму губернатару М. І. Шрэдару, у якім тлумачыла, што ў 1831 г. яна была ў найме і вяла гаспадарку ў памешчыцкага сына Антонія Снарскага ў фальварку Шэвін. Аднойчы Антон Снарскі прыехаў у фальварак разам з памешчыцкім сынам Андрэям Шальцам і шляхцічам Сцепанам Шульгінскім. Паводле Кавалеўскай, пасля вячэры маладыя людзі пачалі патрабаваць ад жанчыны інтымнай блізасці і пагражалі забойствам, калі не выканае іх патрабаванні. Пра гвалт дваранка Кавалеўская паскардзілася засядацелю Полацкага земскага суда Сакалоўскаму. Аднак у ходзе вышуку Сакалоўскі не прыняў двух сведкаў гэтага злачынства, а асведчанне Кавалеўскай акушэркай і штаб-лекарам увогуле схаваў. У такіх абставінах дваранка прасіла Віцебскага грамадзянскага губернатара камандзіраваць чыноўніка па асаблівых даручэннях, каб быў праведзены аб'ектыўны вышук, а вінаватыя пакараны[67].

---

[61] НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 3612. Арк. 12–12адв.
[62] НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 1420. Арк. 7.
[63] Тамсама. Арк. 7адв.
[64] Тамсама.
[65] Тамсама
[66] Тамсама. Арк. 22адв.
[67] НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 3569. Арк. 3–4.

У 1841 г. на імя Мінскага грамадзянскага губернатара М. В. Сушкова паступіў рапарт ваенна-павятовага начальніка Барысаўскага, Вілейскага і Дзісненскага паветаў, у якой гаварылася, што ад мешчаніна яўрэя Іофэ паступіла скарга пра нанясенне яму абразаў і пабояў станавым прыставам Яцкоўскім. Ваенна-павятовы начальнік паведамляў, што ўжо загадаў прыставу Яцкоўскаму спыніць пераслед і помсту яўрэям, «дабы почувствовал снисхождение начальства на предь устранял себя от нареканий»[68]. Нагляд за паводзінамі Яцкоўскага быў даручаны Дзісненскаму земскаму спраўніку. Пры гэтым ваенна-павятовы начальнік дадаваў, што сам канфлік вычарпаны, бо яўрэй Іофэ «потушил огонь обиды» на станавога прыстава[69].

У 1842 г. Мінскаму грамадзянскаму губернатару Г. Ф. Дамелмейеру была пададзена скарга былога служачага Татарскага ўланскага палка Івана Лельчыцкага. У ёй гаварылася, што 23 чэрвеня 1841 г. падаў скаргу ў Вілейскі земскі суд пра разбойны напад у начы на ягоную кватэру ў мястэчку Іўе. Гэта злачынства ўчынілі яўрэі, якія збілі яго і забралі маёмасць. Толькі на пачатку жніўня весці гэту справу было даручана прыставу 1-га стана Архіповічу. Аднак вышук моцна замарудзіўся. Тым часам, знаходзячыся ў цяжкім матэрыяльным становішчы, без кватэры і службы, вымушаны прадаваць вопратку, каб пракарміць сям'ю, Іван Лельчыцкі падаў паўторную скаргу ў Вілейскі земскі суд. Аднак у гэты раз не атрымаў ніякага адказу, у выніку чаго вымушаны быў звярнуцца да губернатара[70]. У сваё апраўданне Вілейскі земскі суд паведаміў Мінскаму губернатару, што справа пра нанясенне пабояў Лельчыцкаму яўрэямі мястэчка Іўе сапраўды была даручана прыставу 1-га стана 8 жніўня 1841 г., а 14 лістапада 1841 г. ён артымаў распа-

[68] НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 761. Арк. 3–3адв.
[69] Тамсама. Арк. 3адв.
[70] НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 819. Арк. 1–1адв.

раджэнне паскорыць вышук[71]. У выніку, прыстаў 1-га стана не знайшоў ніякага сведчання пра бойку і рабаванне[72].

Былі выпадкі, калі прадстаўнікі земскай паліцыі абвінавачваліся не толькі ў злоўжыванні службовым становішчам або ў невыкананні сваіх абавязка, а ва ўдзеле ў злачынствах. Напрыклад у 1827 г. у Мінскую губернскую ўправу паступіла скарга на пінскага земскага спраўніка. Сутнасць справы была ў тым, што памешчык Пінскага павета Якаў Юшкевіч, яго жонка Анэлія Юшкевіч і іх пляменніца Мар'яна Хілінская да такой ступені бязлітасна абыходзіліся са сваімі прыгоннымі сялянамі, што некаторыя з іх памерлі. Пра гэта стала вядома Пінскаму земскаму суду і сужэнцы Юшкевічы разам з пляменніцай былі дастаўлены ў Мінск для вынясення прысуду і наступнай высылцы ў Сібір. Аднак у ходзе судовага разбіральніцтва, Юшкевічы, каб пазбегнуць пакарання, абвінавацілі Пінскага земскага спраўніка Тржцінскага ў тым, што ён, па-першае, праз даўгавыя паперы вымагаў у іх грошы, а па-другое, скраў розных рэчаў з іх маёнтка[73].

У святле гэтых абвінавачванняў Сенат прыпыніў суд над Юшкевічамі і запатрабаваў, каб як мага хутчэй быў праведзены вышук у дачыненні пінскага земскага спраўніка Тржцінскага. Правядзенне вышуку ў Пінскім павеце было даручана «губернскому казенных дел стряпчему Янилевскому», які павінен быў перадаць спраўніку прадпісанне з'явіцца ў Мінскае губернскае праўленне для адказу на «вопросные пункты»[74]. Аднак гэты вышук зацягнуўся і, адпаведна, суд над Юшкевічамі. Янілеўскі ў рапарце пісаў: «Весь Пинский нижний земский суд и исправник Тржцинский по распоряжению губернского начальства занимаются поимкой появившейся

[71] НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 819. Арк. 2.
[72] Тамсама. Арк. 7.
[73] НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 250. Арк. 236.
[74] Тамсама. Арк. 236адв.

в Пинском повете разбойников. И что он стряпчий отправился вместе с ними для содействия в переловлении преступников и как сие кончится, то немедленно приступит к исполнению поручения»[75].

У чэрвені 1836 г. Віцебскі грамадзянскі губернатар М. І. Шрэдар атрымаў ліст ад генерал-губернатара П. М. Дзякава. У ім гаварылася, што дваранін Віцебскага павета Якаў Буевіч падаў скаргу на «грабительство причененное в его доме евреем Лейзаром и пятисотским Лазуком, которые прибив до бесчувствия его родного брата, находившегося дома, ограбили разных вещей и денег, оцененных им суммою на 886 рублей ассигнациями»[76]. Генерал-губернатар загадаў, так як абвінавачанне ў рабаванні датычылася служыцеля земскай паліцыі, даручыць добранадзейнаму чыноўніку правесці вышук па гэтай справе[77].

У 1833 г. засядацель Дзісенскага ніжняга земскага суда Яцкоўскі і інспектар Зайкоўскага ключа Сальмаковіч былі абвінавачаны ў прымяненні падчас допытаў беглага салдата Трафімава катаванняў, якія былі забаронены ў Расійскай імперыі ўказамі ад 8 лістапада 1774 г. і ад 27 верасня 1801 г. Па паказаннях Трафімава: «Причиняли ему побои, прикладывали ему под обе пазухи (подмышки. — *Аўт.*) по горячему яйцу, и что от сего, по свидетельству доктора найдены у Трофимова под обеими пазухами <...> раны произшедшие от воспаления»[78]. Самі Яцкоўскі і Сальмаковіч у катваннях не прызналіся. Каравульны, які нёс варту падчас допыту, не быў дапытаны, бо памёр. А шэраговыя інваліднай каманды Дамоўскі і Тычко пад прысягаю не пацвердзілі паказанні Трафімава. Гэта справа была адаслана на разгляд Сената. Толькі ў 1836 г. была прынята ад-

[75] НГАБ. — Ф. 295. Воп. 1. Спр. 250. Арк. 236адв.–237.
[76] НГАБ. — Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 6301. Арк. 1.
[77] Тамсама.
[78] НГАБ. — Ф. 145. Воп. 2. Спр. 42. Арк. 80.

ведная пастанова. У ёй гаварылася, што па ўказе імператара Сенат слухаў запіску з апеляцыйнай справы па абвінавачанні засядацеля Яцкоўскага і інспектара Сальмаковіча і заключыў: «Оставить в сильном подозрении и вместе с тем как подозрительных чиновников из полицейской службы исключить»[79]. Але з-за таго, што абвінавачанні ў катванні не былі даказаныя і Яцкоўскі разам з Сальмаковічам не былі арыштаваныя, было пастаноўлена — «подсудимости сей в послужных списках не показывать»[80].

Такім чынам, агульнарасійскія правілы ў дачыненні да земскай паліцыі практычна не працавалі ў заходніх губернях Расійскай імперыі. У ўрада не было адзінай канцэпцыі адносна фарміравання складу ніжніх земскіх судоў гэтых губерняў. На працягу канца XVIII — першай паловы XIX ст. практыка прызначэння і выбарнасць на пасады ў ніжнія земскія суды чаргавалася або сумяшчалася. Акрамя гэтага, у адрозненне ад цэнтральных губерняў, у заходніх не было засядацеляў ад дзяржаўных сялян. Асноўны дакумент, які рэгуляваў дзейнасць ніжніх земскіх судоў у Расійскай імперыі «Учреждения о губерниях» (1775 г.), адпавядаў рэчаіснасці толькі ў частцы шматлікіх абавязкаў, якія ўскладаліся на паліцэйскіх чыноўнікаў. Ні прапісаныя спосабы камплектацыі земскіх судоў, ні механізм функцыянавання не супадалі з рэальнымі практыкамі. Практычным шляхам былі выпрацаваны найбольш рацыянальныя правілы іх функцыянавання — падзел павета на ўчасткі і замацаванне іх за засядацелямі ніжніх земскіх судоў. Гэта правіла атрымала законнае афармленне толькі ў 1837 г. падчас рэфармы земскай паліцыі.

Адмоўна на дзейнасці ніжніх земскіх судоў адбівалася адсутнасць дакладнай сістэмы іх узаемадзеяння на міжпавято-

[79] Тамсама. Арк. 80адв.
[80] НГАБ. — Ф. 145. Воп. 2. Спр. 42. Арк. 81.

вым і міжгубернскім узроўнях. Уся камунікацыя паміж земскімі паліцыямі розных паветаў і губерняў, а таксама зносіны з рознымі ўстановамі і міністэрствамі, адбывалася толькі праз пасрэдніцтва губернатара.

Надзвычайная загружанасць чыноўнікаў ніжніх земскіх судоў і невялікае жалаванне рабілі непрыстыжнымі гэтыя пасады і на іх прэтэндавалі асобы з сумніўнымі прафесійнымі здольнасцямі. Аднак, нягледзячы на ўсведамленне праблемы якасці кадравага складу і эфектыўнасці земскай паліцыі, расійскі ўрад не мог выдаткаваць большае фінансаванне.

З боку насельніцтва і губернскай адміністрацыі выказвалася незадаволенасць дзейнасцю земскай паліцыі, якая не выконвала ці выконвала недастаткова свае функцыі. Паліцэйскіх чыноўнікаў абвінавачвалі ў невыкананні сваіх абавязкаў, лабіраванні інтарэсаў аднаго з бакоў у канфліктах, у непадпарадкаванні начальству або амаральных паводзінах. Былі выпадкі, калі прадстаўнікі земскай паліцыі абвінавачваліся не толькі ў злоўжыванні службовым становішчам або ў невыкананні сваіх абавязкаў, а ў здзяйсненні злачынстваў.

Юрый Снапкоўскі

СЛУЖБОВЫЯ АСОБЫ НЯМЕЦКАГА І ФРАНЦУЗСКАГА ПАХОДЖАННЯ Ў СВІСЛАЧЫ (XIX — ПАЧАТАК XX ст.)

Адным з асноўных фактараў, якія ў перыяд Расійскай імперыі садзейнічалі поліэтнічнасці і поліканфесійнасці мястэчка Свіслач Ваўкавыскага павета Гродзенскай губ., з'яўлялася знаходжанне тут дзяржаўных устаноў медыцынскай, адукацыйнай, фінансавай і некаторых іншых сфер дзейнасці, якія ў прафесійным плане прываблівалі асоб іншаземнага паходжання магчымасцю не толькі забяспечыць сябе «хлебам надзённым», але прымяняць тут свае здольнасці і максімальна рэалізоўваць уласны духоўна-інтэлектуальны патэнцыял.

Выключную ролю ў «прыцягненні кадраў» у невялікае мястэчка (на працягу XIX — пачатку XX ст. насельніцтва Свіслачы вагалася ў межах прыкладна 1–3 тыс. чал.) адыгрывала стабільна існуючая тут пад рознымі статуснымі амплуа цэнтральная для мясцовага ўзроўню навучальная ўстанова — губернская гімназія (1805–1835 гг.), «павятовая» гімназія (1835–1851 гг.), дваранскае вучылішча (1851–1860 гг.), прагімназія (1860–1863 гг.). Пазней тут існавала настаўніцкая семінарыя (1876–1921 гг.).

Архіўныя дакументы афіцыйнага справаводства дзяржаўных устаноў, шматлікія даведачныя выданні і навуковая літаратура даюць магчымасць даследаваць персанальны склад службовых асоб рэгіянальнага ўзроўню і, разам з тым, ідэнтыфікаваць сярод іх, паводле пэўных крытэрыяў, «іншаземны элемент».